Антон Янкоўскі



..Мы вучымся быць людзьмі.
Штодня і штоноч, ад нараджэньня
і да скону...

# Крыжык на далоні

***Імпрэсіі***

## ТЭЛЕФОННАЕ ЭСЭ

– Хвіліну… – і тэлефон маўчыць.

Чакаю і адчуваю, як вецер бегае сярод валасоў. А насупраць мяне на балконе шматпавярховага будынку дзяўчына размаўляе з кімсьці па тэлефоне, усьміхаецца, нешта вымалёўвае рукамі ў паветры і зусім не зважае на мяне. А вунь, яшчэ адна, яшчэ і яшчэ – размаўляюць.

А я чакаю хвіліну. Не дачакаўся… Не, ня я, хлопец, што стаяў ля пад’езду, увесь час пазіраючы на занавешаныя вокны і штохвілінна набіраючы чыйсьці нумар. Толькі яму не адказалі, бо, нярвова кінуўшы тэлефон у кішэню, хлопец падышоў да прыпынку, сеў у тралейбус і вырашыў… прадаць тэлефон, каб не было болей спакусы набраць яе нумар.

А я чакаю. Здаецца, ужо пятая хвіліна пады-

ходзіць да свайго лагічнага завяршэньня, ды толькі гадзіньнік, што вісіць пасярод плошчы, марудзіць, адмераўшы майму чаканьню ўсяго 20 секунд. Няўжо ён, гэты вусаты кіроўца часу, ня можа крыху падацца наперад? “Не, – адказвае гадзіньнік. – Іншыя людзі могуць спазьніцца на цягнік. У мяне ж няма тэлефону, каб іх папярэдзіць.” – “Вазьмі мой.” – “Але тады не дачакаешся ты…”

Лепей ужо не дачакацца. Гэта ня так балюча, як атрымаць катэгарычнае “не”. Зрэшты, справа зусім не ў адказе, бо, якім бы ён ні быў – станоўчым альбо адмоўным, – ён надае штуршок жыцьцю, задае накірунак далейшаму руху. А чаканьне як бы запавольвае тэмп успрыманьня рэчаіснасьці, агортвае цябе меладычнай вечнасьцю, бо, калі хвіліна ператвараецца ў жыцьцё, ты пачынаеш заўважаць дыханьне навакольля, яго рух, яго лёгкасьць і непаўторнасьць, яго геніяльную дасканаласьць, якая паўсюдна спаласаваная мабільнымі хвалямі, што злучаюць між сабой сваіх абанентаў…

Добра ластаўкам без тэлефону. Гэта мы, людзі, зрабілі сабе яшчэ адну дурніцу, якая часам толькі псуе нервы. Дае нам шмат магчымасьцяў, і, у той жа час, цалкам абмяжоўвае. А ластаўкі лётаюць, расьсякаюць крыламі паветра, нясуць сваім дзеткам паесьці і ў дождж, і ў сонца нясуць, не задумваюцца, што трэба пачакаць адну хвіліну… Вось бы абярнуцца ластаўкай! Ці, напрыклад, скочыць на некалькі стагоддзяў назад, нарадзіцца неандэртальцам, ды пайсьці на паляваньне на мамантa. Увечары вярнуцца, раскласьці вогнішча, засмажыць здабычу, павячэраць і легчы спаць. Заснуць і ня думаць пра гэты бессардэчны тэлефонны хаос…

– Алё! Я згодна, давай сустрэнемся…

* * *

Сёньняшні дзень пайшоў зваць наступны, а я заблытаўся ў стрэлках гадзіньніка, не заўважыўшы, што ў пакой зайшла восень. Яна прывіталася, а я адказаў, што бяз пашпарту катацца на хмары ня возьмуць. Жанчына чамусьці ўсьміхнулася і падаравала мне паветраны шар. Толькі зрабілася самотна, бо няма з кім падзяліцца гэтым маленькім сонейкам. Ды мяне падбадзёрыў маладзік, заўпэўніўшы, што зараз самы час саткаць дыван з лісьця. Няхай на ім застаюцца зімаваць птушкі. Кожнаму патрэбныя сябры, асабліва, калі на тваёй сьцяжыне адбываюцца дарожна-рамонтныя працы. Я ўсьміхнуўся з рамантычнай наіўнасьці маіх таварышаў і паабяцаў запрасіць іх на пачатак будаўніцтва сваёй хаты. Мы падпісалі пагадненьне, і я пайшоў у краму за сілкаваньнем для гадзіньніка. Бо ня справа гэта – стаяць у чарзе па шчасьце.

## КУБАК КАВЫ

Выпіць кавы, абпячыся, пакінуўшы на брудным стале яшчэ некалькі кропляў-успамінаў.

Патэлефанаваць і зноў пачуць знаёмы голас дзяўчыны, якая адкажа, што ваш абанент згубіўся дзесьці па-за межамі мабільнай сеткі.

Уключыць радыё і нетаропка плысьці па хвалях бессэнсоўных гамонак і надакучлівай музыкі ў пошуках адной адзінай песьні-натхненьня.

Пайсьці прыняць душ, адкрыць кран з халоднай вадой, сесьці і пазіраць у задуменьні на празрыстыя кроплі-пачуцьці.

Разаслаць ложак і доўга стаяць успамінаць, куды зьнікла прасьціна, толькі апоўначы зразумеўшы, што яна ператварылася ў попельсьмецьце.

Легчы, заплюшчыць вочы і бачыць самотныя, надакучлівыя сны пра чарговы кубак кавы і страчаннае назаўсёды каханьне.

## МЫ ВУЧЫМСЯ БЫЦЬ ЛЮДЗЬМІ

Мы вучымся быць людзьмі. З ранку да ночы і з вечару да сьвітаньня.

Мы вучымся паводзіць сябе, як людзі, але часам забываем дадаць адно простае слова – адукаванымі.

Мы вучымся думаць, як людзі, але ніколі ня можам знайсьці розьніцы паміж “зайздрасьцю” і “павагай”.

З нашых вуснаў вылятаюць сьвятыя словы – маці, бацька, народ, -але мы не разумеем, што ўсё гэта сінонімы слову “людзі”.

Кожны з нас крычыць: “Я – чалавек!” А скажаш: “Мы – людзі!” – як навокал усталёўваецца люстэркавая цішыня з апушчанымі долу вачыма.

Ніхто не наважваецца назваць сябе людзьмі. А на пытаньне – “чаму?”, усе разыходзяцца ў розныя бакі, каб зноўку стацца паасобку.

Ніхто ня хоча браць на сябе гэту адказнасьць.

Ужо якое стагоддзе ніхто ня можа вывесьці формулу, дзе ў дзейніку стаіць “людзі”, а ў выказьніку “хто мы?”, бо не разумее, дзе ў гэтай матэматычнай зьяве яго месца.

Кожны шукае людзей на вуліцы, у крамах і тэатрах, па інтэрнэце і перапісцы, але забываецца спачатку глянуць у свой пашпарт, на свой фотаздымак.

Кожны з нас, як мазаіка: знойдзецца адна частка, другая, трэцяя – і вось ужо зіхаціць вялікае і непарушнае слова.

Але мы гэтага не разумеем, блукаючы, быццам сьляпыя кацяняты, між навуковых працаў і сатырычных апавяданьняў.

Мы вучымся быць людзьмі. Штодня і штоноч, ад нараджэньня і да скону.

Шкада толькі не заўсёды атрымліваецца…

* * *

Я вучуся на хмарах маляваць сонейка, каб усім навокал было сьветла ісьці дадому падчас навальніцы.

Я выпрабляю з каляровай паперы вялізныя парасоны, каб надакучлівы вятрыска ня біў сваімі кроплямі-сяброўкамі ў твар.

Я рамантую свой вясёлкавы “самаход”, каб людзі, што заблудзіліся ўчас пасьпелі ў тэатр.

Я ксеру лісьце, каб восені не было сумна на прыпынку, чакаючы тралейбуса, які спазьняецца.

І ўвесь гэты час я мару перайначыць нашую краіну, але ў яе ўжо ёсьць свая Канстытуцыя…

## КРЫЖЫК НА ДАЛОНІ

Крыжык на далоні – гэта мая вера. Вера ў Бога-айца, яго Сына і маленькіх Анёлаў, якія лётаюць па ўсім сьвеце і дораць кожнаму з нас кавалак свайго сьвятла, сваёй чысьціні.

Крыжык на далоні – гэта мая надзея. Надзея на сілы свае, на моц свайго духу, на рашучасьць крочыць наперад, туды, дзе з-за гор віднеецца ўзыход сонца.

Крыжык на далоні – гэта мая любоў. Любоў да бліжняга свайго, да бацькі і маці, да краю, дзе нарадзіўся, дзе бегаў па жыце сярод васількоў.

Крыжык на далоні – гэта мая ўпэўненасьць. Упэўненасьць у заўтрашнім дні, у тым, што заўжды будзе хлеб на стале, і сябра мой лепшы мяне падтрымае і пойдзе са мной у падарожжа.

Крыжык на далоні – гэта часьцінка мяне самога, тая, што акамулюе ў маім сэрцы дабрыню і сумленьне, што, быццам пілігрым, шукае спакою сярод хаосу, што не дае збочыць са шляху – гэта часьцінка Бога ў ва мне.

Крыжык на далоні. Ён заўсёды са мной. Дзе б я ні крочыў, куды б мяне лёс не закінуў, як бы дрэнна або хораша мне не было – я заўжды чытаю малітву і ведаю, што Бог мяне чуе.

* * *

Грукат у дзверы. Адчыняю – а там няма нікога…

Тэлефануюць, падымаю – маўчаньне…

Дастаю са скрыні ліст, а ўнутры белая папера…

Бягу наўздагон за кімсьці невядомым, здаецца – нагнаў, а ён, быццам прывід, зьнікае з-пад самых рук і зьяўляецца на тым баку шашы, стаіць і ўсьміхаецца праз вокны аўтамашынаў…

Спыняюся. Бяру крэйду і пачынаю маляваць свае думкі, а атрымліваецца нешта шэрае, накшталт моцнага дажджу, што бесперапынна барабаніць па зямлі, выбіваючы ў ёй яміны… Рву паперу, а яна ніяк ня можа скончыцца, быццам насланьнё якое. Запальваю, выходжу на балкон і ператвараюся ў птаха, што ляціць насустрач зорам…

А нічога не зьмяняецца…

Зноў дождж б’е па расколіне на шыбе, людскі абутак месіць шэрую зямлю, думкі, пачуцьці, словы зьбіваюцца ў сістэму хаосаў – і толькі адзін я сяджу пасярод бессэнсоўных гамонак, дыктатарскіх дыскусіяў, няўпэўненых крокаў у падпарадкаваным руху і бачу зорку…

Падымаюся, здымаю яе са столі, бяру на рукі, прытуляю да сэрца і разумею, што пакуль у небе будзе зьзяць хоць адзін невялікі агеньчык – мы знойдзем выйсьце…

Мы будзем жыць…